# Зямля, што ўся з красы саткана



ДУК “Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”
Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы”

# Зямля, што ўся з красы саткана

## (да 80-годдзя заснавання Докшыцкага раёна)

Докшыцы
2025

Складальнік Капытка А.У

Зямля, што ўся з красы саткана : даведнік / ДУК "Докшыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, Аддзел маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы : [склад. А.У. Капытка]. – Докшыцы, 2025. – 21 с.

## З гісторыі раёна

Звестак пра тэрыторыю Докшыцкага раёна ў старажытнарускі час не захавалася. Можна толькі меркаваць, што гэтая тэрыторыя была толькі паўночным ўскрайкам Менскага княства (альбо Менскай зямлі). Далей на поўнач і ўсход пачыналася Полацкая зямля з Лукомскім княствам. Мяжа праходзіла, напэўна, па лясах і балотах левабярэжжа Бярэзіны, амаль дакладна па мяжы сучаснага раёна, якая і сёння застаецца слабазаселеным краем.

Калі са складу Менскай зямлі часова вылучылася Лагойскае княства, то ў яго павінна была ўваходзіць і сучасная Докшыччына. Гэты край ляжаў далёка ад асноўных цэнтраў княства і быў амаль цалкам пакрыты коўдрай векавечных лясоў. Сярод іх невялікімі выспамі ляжалі сёлы з кавалкамі пашы і выганаў.

Пра лад жыцця ў старажытнарускі час можна меркаваць толькі ў самых агульных рысах. Насельніцтва Докшыччыны ў XI–XIII стагоддзях цалкам складалася з дзяржаўных сялян, абавязкам якіх была выплата даніны натуральнымі прадуктамі – мёдам, воскам, пушнінай, збожжам і інш.

У 1345 годзе Менская зямля (у т. л. Докшыччына) увайшла ў Віленскае княства. Амаль увесь сучасны Докшыцкі раён з сумежнымі часткамі Лагойскага і Барысаўскага ўтваралі Харэцкую воласць, якая згадваецца ў шэрагу велікакняжацкіх грамат канца XIV – пачатку XV стагоддзяў. Харэцкая воласць падзялялася на тэрыторыі асобных сельскіх абшчын. Цэнтрам адной з абшчын былі Докшыцы. Асаблівасцю лёсу Харэцкіх абшчын, так званых сёл, было драбленне паміж некалькімі саўладальнікамі.

На працягу канца XIV–XV стагоддзяў былыя дзяржаўныя даннікі з Харэцкай воласці былі раздадзены некалькім буйным феадальным родам і віленскаму капітулу. Але пераход з дзяржаўнага ў прыватнаўласніцкае падданства мала змяніў жыццё насельнікаў Докшыччыны. Павіннасці сялян, як цяглых, так і даннікаў, вызначаліся ад зямельнага надзела, якім яны карысталіся для ўласных патрэб. У XVI стагоддзі лад жыцця на Докшыччыне мяняўся вельмі павольна, бо гэтаму спрыяла аддаленасць ад асноўных феадальных цэнтраў.

Канец XVI – пачатак XVII стагоддзяў быў часам значных перамен у грамадскім жыцці ВКЛ. Рэзка ўзмацнілася актыўнасць каталіцкай царквы. Паны-каталікі актыўна будавалі ў сваіх маёнтках не толькі ўніяцкія цэрквы, але і касцёлы, каталіцкія кляштары, надавалі ім зямельныя ўладанні. Гэты працэс не абмінуў і Докшыччыну.

XVIII стагоддзе было часам паступовага заняпаду Рэчы Паспалітай. На Докшыччыне асабліва цікавых падзей у гэты час не адбывалася.

На пачатку 1793 года пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай Докшыччына апынулася ў складзе Расійскай імперыі. Замест былых ваяводстваў была ўтворана Мінская губерня з шэрагам паветаў, сярод якіх 3 мая 1793 года з'явіўся Докшыцкі павет. Заходні ўскраек раёна, з маёнткам Валкалата, трапіў у Пастаўскі павет. Аднак гэтыя паветы праіснавалі нядоўга. У 1796 годзе яны былі скасаваны, а тэрыторыя іх падзелена паміж суседнімі Барысаўскім і Вілейскім паветамі. Большасць Докшыччыны апынулася ў складзе Барысаўскага павета Мінскай губерні, а тэрыторыя на захад ад лініі Крулеўшчына – Докшыцы – Гняздзілава ўвайшла ў Вілейскі павет.

Пры пераходзе ў Расійскую імперыю большасць землеўладальнікаў захавала свае маёнткі. Усяго на тэрыторыі раёна згадваецца каля 400 населеных пунктаў (месцазнаходжанне некаторых вызначыць цяжка), якія адносіліся да 60 маёнткаў. Сярод паселішчаў буйнейшым быў заштатны горад Докшыцы. Найбуйнейшымі былі маёнткі Порплішча, Валкалата, Бераснёўка.

У 2-й палове XIX – пачатку XX стагоддзяў тэрыторыя сучаснага Докшыцкага раёна ўваходзіла ў склад Вітуніцкай, Докшыцкай, Тумілавіцкай частак Бягомльскай, Бярэзінскай, Вяліка-Долецкай, Мільчанскай і Асаўской валасцей Барысаўскага павета, Мінскай губерні, Параф'янаўскай, Порплішчанскай, частак Валкалацкай і Жаснянскай валасцей Вілейскага павета, а таксама Глыбоцкай воласці Дзісенскага павета Віленскай губерні.

Пасля адмены прыгоннага права буйное памешчыцкае землеўладанне ў заходніх губернях захавалася, у т. л. і на Докшыччыне. Буйных землеўладальнікаў з сялян (звыш 150 дзес. зямлі) на тэрыторыі Докшыцкага раёна не было.

Сельская гаспадарка ўсё шырэй уцягвалася ў рынкавыя адносіны. У Докшыцах былі заснаваны завод сальных свечак і завод сельтэрскіх і мінеральных вод, смолашкіпінарны завод. Былі заснаваны вінакурныя заводы ў маёнтках Бераснёўка, Параф'янава, Сітцы, завод «гарачыцельных він» у Шклянцах, у маёнтку Вешкі вырабляўся спірт «для ўласных патрэб». У многіх маёнтках былі пабудаваны млыны – вадзяныя і ветракі: Докшыцы, Гняздзілава, Запонне, Чарніца, Ліпск, Вускрам'е, Маргавіца, Ваўча, Асавок, Сцюдзёнка.

Пшаніца, жыта, ячмень, грэчка і авёс назапашваліся для продажу ў Барысаве і Докшыцах, галоўным чынам у мясцовых яўрэяў-гандляроў.

Да канца XIX стагоддзя памешчыцкая зерневая гаспадарка пайшла на спад. Змяншэнне прыбыткаў ад вытворчасці збожжа памешчыкі кампенсавалі малочнай жывёлагадоўляй, якая стала па сутнасці галоўнай галіной сельскай гаспадаркі. Але ў сялян сельская гаспадарка развівалася вельмі слаба. Не змянілася становішча і ў пачатку XX стагоддзя. Таму частка сялян адпраўлялася на адыходныя промыслы, да якіх, найперш, можна аднесці сплаў лесаматэрыялаў. Лес дастаўляўся да ракі Бярэзіна і яе прытокаў, потым адпраўляўся ў Крамянчуг, Рыгу і іншыя гарады. У паўднёвыя губерні і за мяжу сплаўляліся выробленыя мясцовымі жыхарамі мачты, брусы, калёсныя абады, цыноўкі і рагожы, драніцы і гонты для стрэх, смала, дзёгаць, шкіпінар, паташ.

У вольны час сяляне займаліся саматужнымі промысламі: рабілі калёсы, сані, дугі, простую мэблю, бочкі, конную збрую і г. д. Сярод сялян Параф'янаўскай, Порплішчанскай, Валкалацкай валасцей даволі распаўсюджанымі былі ткацтва і пража: ткалі мешкавіну, падкладачны матэрыял, на сарочкі і тонкае; ткалі грубае сукно, іншыя вырабы. Свае вырабы сяляне прадавалі на базарах і кірмашах.

Гандаль канцэнтраваўся пераважна па цячэнні ракі Бярэзіна і па Бярэзінскім канале. З 8 прыстаняў Барысаўскага павета буйнейшай з'яўлялася Бярэзінская. Галоўным прадметам вывазу быў лес (87 %), потым ішлі смала, дзёгаць, спірт. Увозіліся пшаніца (больш за 30 % усяго прывозу), жыта (каля 20 %), соль (13 %), віно (7 %). З Масквы, Мінска і іншых вялікіх гарадоў увозіліся сукно, бакалейныя тавары.

Паводле перапісу 1897 года на тэрыторыі, што займае цяпер раён, пражывала 125 725 чалавек. З усіх валасцей па колькасці насельніцтва вылучалася Параф'янаўская (9101), Докшыцы (7288), Бярэзінская (6512), Вітуніцкая (5985), Тумілавіцкая (5905) і інш.

З канца 1904 года ў краіне нарастаў рэвалюцыйны рух. Аднак у цэлым сялянскі рух заставаўся стыхійным і несвядомым. Найбольш распаўсюджанай формай у Мінскай губерні былі масавыя парубкі памешчыцкіх лясоў. Імі былі ахоплены Асаўская і іншыя валасці Барысаўскага павета.

Значнае месца ў сялянскім руху займалі ўзброеныя сутычкі з паліцыяй і казакамі. Буйныя сутычкі адбываліся ў верасні 1905 года ў вёсцы Дабрунь Вітуніцкай воласці. Такое назіралася і ў іншых месцах.

У параўнанні з сялянскім, рабочы рух насіў больш арганізаваны характар. Восенню 1906 года ён таксама пайшоў на спад. Буйнымі палітычнымі выступленнямі рабочага класа Беларусі былі першамайскія стачкі 1907 года. Рабочыя Докшыц адзначылі гэты дзень масавай палітычнай забастоўкай.

У канцы лета 1907 года ў Докшыцах праходзіла канферэнцыя БСГ (Беларускай сацыялістычнай грамады).

15 ліпеня 1914 года пачалася I сусветная вайна. З лета 1915 года значная частка тэрыторыі Беларусі стала арэнай ваенных дзеянняў. У неакупіраваных раёнах (куды ўваходзіла і тэрыторыя сучаснага Докшыцкага раёна) многія галіны гаспадаркі спынілі вытворчасць з-за адсутнасці сыравіны і кваліфікаваных рабочых. У выключна цяжкім стане апынулася сельская гаспадарка. Да канца 1916 года глыбокая разруха ахапіла ўсе галіны эканомікі краіны. Рэвалюцыйны крызіс стаў агульнанацыянальным.

## З гісторыі горада

Часам нараджэння горада прынята лічыць дату, пад якой ён упершыню згадваецца ў летапісах. На жаль, гісторыя не данесла да нас дакладную дату заснавання Докшыц. Першыя звесткі пра наш горад знойдзены ў грамаце вялікага князя Вітаўта ў 1407 годзе, дзе згадваюцца сяляне-даннікі «doxyczahe». Даннікі з Докшыц перадаваліся віленскаму ваяводзе Войцеху Манівіду.Пасля смерці Манівіда ў 1423 годзе Докшыцы перайшлі да яго сына Яна (Івашкі) Манівідавіча, у 1485 г. да сына апошняга – Войцеха. Пасля яго смерці ў 1475 годзе спадкаемцамі манівідавай спадчыны сталі дзве сястры – Ядвіга (жонка Алехны Судзімонтавіча) і Соф’я (жонка Мікалая Радзівілавіча). Пры падзеле спадчынай уласнасці частка двароў у Докшыцах дасталася Ядвізе, частка – Соф’і .

У далейшым Докшыцы зведалі яшчэ большае драбленне паміж уласнікамі. Доля Ядвігі адышла да яе дачкі Соф’і, якая ў канцы 15 ст. выйшла замуж за князя Аляксандра Юр’евіча Гальшанскага, а пасля смерці ў 1517годдзн была падзелена паміж чатырмя яе дочкамі і сынам Паўлам, віленскім біскупам. З іх доля ў Докшыцах дасталася Ганне Гальшанскай (жонка Мікалая Юр’евіча Паца), потым яе сынам. Доля ж Соф’і Радзівілавай перайшла да яе чатырох сыноў – Мікалая, Яна, Юрыя і Войцеха. Пасля смерці апошняга з іх ў 1519 годзе адбыўся чарговы падзел уладанняў. Частка даннікаў з Докшыц адышла да старэйшага з братоў – Мікалая Мікалаевіча Радзівіла,

пазней віленскага ваяводы. Яго спадкаемцамі сталі жонка Альжбэта і тры сыны – Мікалай, Ян і Станіслаў, якія ў 1526 годзе падзялілі бацькоўскія ўладанні.

У 1536 годдзе сярод спадчыны Мікалая Мікалаевіча Радзівіла ўспамінаюцца “докшыцкія людзі”, памер іх штогадовай даніны складаў 36 пудоў мёду.

З трох братоў Радзівілаў апошні, Ян, памёр у 1542 годдзе, пасля чаго яго частка Докшыц перайшла ва ўласнасць трох яго дачок. Да 1565 года дзве з іх памерлі бяздзетнымі. Бацькоўская спадчына адышла да трэцяй сястры – Ганны, якая была жонкай Станіслава Пятровіча Кішкі. У 1560 годдзе ёй належылі 48 двароў (службаў) у Докшыцах, дзе ў той час ужо існавала царква.

Род князёў Гальшанскіх, уладальнікаў судзімонтаўскай часткі Докшыц, згас смерцю біскупа Паўла ў 1555 годдзе. Спадчына адышла да нашчадкаў па жаночай лініі. Імі сталі дзве дачкі Ядвігі Гальшанскай ад шлюбу з Янам Літаворам Храбтовічам, а таксама дзеці Ганны Гальшанскай. Судзімонтаўская спадчына была падзелена паміж імі на невялікія долі. Адзін з сыноў Ганны Гальшанскай і Мікалая Паца, Дамінік, у 1557 годдзе прадаў частку даннікаў “на Руси в Довкишчах” Станіславу Садоўскаму, служэбніку Ганны Кішчынай. Апошняя ў красавіку 1560 года купіла долю Садоўскага ў Докшыцах за 300 літоўскіх грошай, а праз шэсць месяцаў падаравала докшыцкіх даннікаў (“отчизных” і купленных “на вечность”) служэбніку Пятру Скалдіцкаму. У 1561 годдзе Ганна набыла ў Станіслава Мікалаевіча Паца са згоды яго братоў Мікалая, Дамініка і Паўла (“маючи от всее братии моц”) іх долю ў Докшыцах, якая налічвала “полтори службы” людзей. Заставалася яшчэ адна частка Докшыц, што належыла сястры Ганны Гальшанскай Ядвізе, потым дачцэ апошняй Ганне і яе мужу Юрыю Осціку. У 1569 годдзе іх сын Мікалай Юр’евіч Осцік падараваў гэту частку Докшыц свайму зяцю, князю Льву Сангушку-Кашырскаму. Далейшы след яе не прасочваецца.

Паводле адміністрацыйнай рэформы, якая была праведзена ў ВКЛ у 1565-66 гг., Докшыцы ўваходзілі ў склад Менскага павета. У час Інфлянцкай вайны 1558-82 гг. ваколіцы Докшыц з’яўляліся адной з апорных баз войск Рэчы Паспалітай. Пасля смерці ў 1600 годдзе Ганны Кішчынай Докшыцы належалі яе сыну Станіславу Кішку, а фактычна сынам апошняга. З іх Станіслаў Станіслававіч Кішка перайшоў з кальвінізму ў каталіцтва і пазней стаў жамойцкім біскупам, у 1608 годзе ён заснаваў у Докшыцах драўляны касцёл і падараваў яму фальварак Туркі.

У 1621 г. Докшыцы атрымалі статус мястэчка, а ў 1622 г. Станіслаў Кішка падараваў асноўную яго частку (на правым беразе р. Бярэзіна) з навакольнымі вёскамі Дамашы і Таргуны капітулу жамойцкага біскупства, якое ў той час узначальваў. Левабярэжную частку Докшыц у сярэдзіне 18 стагоддзя набыў у спадкаемцаў Кішкаў менскі кашталян Юдзінскі, які потым прадаў яе Антонію Гутаровічу.

У час вайны маскоўскай навалы 1654-67 гг. Докшыцы моцна пацярпелі. У 1655 г. праз беларускія землі па лініі Слуцк – Менск – Докшыцы – Дзісна планавалася правесці мяжу паміж Масквой і Швецыяй, але маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч адмовіўся ад прапановы шведскага боку. У Паўночную вайну 1700-1721 гг. Докшыцы ў 1708 годдзе апынуліся на шляху руху шведскага корпуса генерала А. Левенгаўпта. Шведы спалілі мястэчка і касцёл.



У 1745 годдзе пачалося будаўніцтва новага касцёла (асвячоны у 1753), пры якім у 1781 годдзе са згоды Папы Рымскага Пія VI пачало працаваць брацтва св. Тройцы.

Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годдзе Докшыцы былі далучаны да Расейскай імперыі, сталі цэнтрам Докшыцкага павета. У 1795 годдзе яны атрымалі статус горада, 22 студдзеня 1796 года – герб: у зялёным полі два ўзгоркі, на якіх ляжаць збаны, з іхніх гарлавін цякуць сярэбраныя крыніцы. З 1797 года Докшыцы ў складзе Барысаўскага павета Мінскай губерні, заштатны горад, які хутка зноў стаў называцца мястэчкам. Уладанні жамойцкага біскупства, канфіскаваныя расейскім урадам, былі перададзены генерал-маёру расейскіх войск В. Мілашэвічу.

У 1800 годдзе ў мястэчку налічвалася 152 двары, з якіх Мілашэвічу належалі 106 (35 хрысціянскіх і 71 габрэйскіх), 42 двары (у тым ліку 12 габрэйскіх) складалі частку ўдавы Людвігі Гутаровічавай і называліся Докшыцкай Слабадой. Яшчэ 4 двары былі заселены чыншавай шляхтай і належалі плябаніі мясцовага касцёла. Усяго насельніцтва складала 1118 чалавек (507 мужчын і 611 жанчын). У мястэчку існавалі габрэйская школа і 2 уніяцкія царквы (па адной у частках Мілашэвіча і Гутаровічавай), якія ў 1843 годдзе былі пераўтвораны ў праваслаўныя. У Докшыцах штогод праводзіўся кірмаш у дзень Святой Тройцы, у Докшыцкай Слабадзе – у дзень Узвіжання Святога Крыжа.



Маёнтак Мілашэвіча ахопліваў шэраг навакольных вёсак (Валасатку, Вецяры, Плітніцу, Таргуны і інш.). Пазней ён быў вернуты ў скарб. У 1812 годдзе скарбава частка мястэчка налічвавла 99 двароў. Докшыцкая Слабада (Лісоўшчына) была ў той час уласнасцю Ігнацыя і Бенядзікта Пяткевічаў. У час вайны 1812 года праз

Докшыцы ў ліпені прайшлі войскі віцэ-караля Італіі Я. Багарнэ, а ў кастрычніку – адступаючыя часткі корпуса генерала К.Ф. Врэдэ, якія разрабавалі мястэчка. У перыяд паўстання 1830-31 гг. у красавіку – маі 1831 года каля Докшыц адбыліся баі вілейскіх паўстанцаў С. Радзішэўскага з царскімі войскамі.

У 1824 г. ў мястэчку дзейнічала суконная майстэрня Давіда Шапіры. У ёй працавалі тры майстры і чатыры рабочыя, якія абслугоўвалі 2 ткацкія станкі. Д.Шапіру (купцу 3-й гільдыі) належалі ў Докшыцах 3 крамы. Пасля адмены пыгоннага права ў 1861 годдзе Докшыцы сталі цэнтрам аднайменнай воласці.

У 1863 – тут была пабудавана новая праваслаўная царква на сродкі, адпушчаныя ўрадам. У склад прыхода акрамя праваслаўных вернікаў Докшыц уваходзілі жыхары навакольных вёсак Альхоўка, Валасатка, Дамашы, Загарані, Кожына, Козікі, Крыкуны, Лапуты, Лаці, Плітніца, Свіное, Таргуны, Туркі і Янкі.

У 1868 годдзе ў Докшыцах пражывала 1613 жыхароў (801 мужчына і 812 жанчын), у тым ліку 310 праваслаўных, 241 католік, 12 магаметан, 1050 габрэяў, сярод месьцічаў – 62 рамеснікі; меліся 1 мураваны і 266 драўляных дамоў, мураваная царква, драўляны касцёл, 4 габрэйскія малітоўныя дамы, 22 лаўкі, 17 шынкоў, 3 бровары і паравы млын.



У Докшыцах штотыднёва праходзілі кірмашы (больш значныя праводзіліся ў аўторак на масленічным тыдні і ў свята Прачыстай 15 жніўня), на якіх пераважна прадаваліся азімае і яравое збожжа, лён, буйная рагатая жывёла, коні розныя тавары і інш.

Да 1870-х гг. у Докшыцах дзейнічалі магістрат (Ратуша) і Дума (потым – гарадское спрошчанае кіраванне), у 2-й палове 19 стагоддзя размяшчаліся валаснoе праўленне, кватэра прыстава 3-га стана Барысаўскага павета, паштовая станцыя, працавала народнае вучылішча. На працягу 19 стагоддзя канчаткова сфармавалася вулічная сетка Докшыц (цэнтральныя Барысаўская, Даўгінаўская, Глыбоцкая і Полацкая вуліцы, да іх прымыкалі – Ветраная, Сянная, Татарская і інш.). У канцы 19 ст. ў Докшыцах пачалі дзейнасць пазыка-ашчаднае і пажарнае таварыствы.
Паводле перапісу 1897 г. ў Докшыцах пражывала 3642 жыхары, у 1904 годдзе – 4103, сярод якіх 119 дваран, 6 святароў, 30 купцоў, 3124 мешчаніны, 337 сялян, 14 іншаземцаў. Па веравызнанні – 439 праваслаўных, 1 старавер, 361 католік, 4 пратэстанты, 75 магаметан, 2762 іўдзеі. Агульная пісьменнасць жыхароў складала

40,6% (усяго па губерні – 17,8%). У 1904 годдзе ў Докшыцах налічвалася 435 драўляных і 1 мураваны дамоў, 2 гасцініцы, 2 сукнавальні (працавалі 3 рабочыя), 1 аптэка і 2 аптэкарскія крамы.



З 1902 года ў Докшыцах працавала 2-класнае пачатковае вучылішча (з 1907 – 4-класнае, з 1913 – вышэйшае пачатковае).

У пачатку 20 стстагоддзя ў Докшыцах і наваколлі была вядома батлейка Патупчыка (асабліва папулярнымі з’яўляліся пастаноўкі “Мікіта” і “Земскі Арскі”). У час 1-й сусветнай вайны 1914-18 гг. Докшыцы з’яўляліся прыфрантавым горадам (у верасні 1915 на непрацяглы час былі заняты германскімі войскамі). У снежні 1917 года ў Докшыцах была ўсталявана савецкая ўлада. У лютым – лістападзе 1918 – горад акупаваны германскім войскамі. У сакавіку 1918 г. Докшыцы ўваходзяць у склад абвешчанай БНР.



З 20 жніўня 1919 да ліпеня 1920 года Докшыцы былі заняты польскімі войскамі. Паводле Рыжскага мірнага дагавора 1921 года да 17 верасня.1939 года Докшыцы знаходзіліся ў складзе Польшчы, з’яўляліся цэнтрам гміны Дзісенскага павета Віленскага ваяводства.

З 1939 года Докшыцы ў складзе БССР, у Вілейскай вобласці, 3,6 тыс. жыхароў. 15студзеня 1940 года Докшыцы афіцыйна атрымалі статус горада, сталі цэнтрам раёна. У 2-ю сусветную вайну Докшыцы з 9ліпеня 1941 года былі акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі, якія знішчылі ў горадзе і раёне 4931 чалавека. У Докшыцах стаяў вайсковы гарнізон, які неаднаразова падвяргаўся нападу партызан. Горад вызвалены 2 ліпеня 1944 года. Са снежня 1962 па студзень 1965 года Докшыцы ўваходзілі ў склад Глыбоцкага раёна. У 1959 годдзе тут пражывала 2,1 тыс. жыхароў, у 1971 – 3,9 тыс.чалавек.

Цэнтр горада захаваў гістарычную планіроўку 17 ст., але з помнікаў захавалася толькі Пакроўская царква — помнік архітэктуры пачатку 20 ст.





**Докшыцкі раён – Спадчына Беларусі**

Докшыцкі раён, чыя плошча складае 2 267,61 км2, размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы Віцебскай вобласці. Мяжуе з Глыбоцкім, Пастаўскім, Ушацкім, Лепельскім, Мядзельскім, Лагойскім і Барысаўскім раёнамі.

Найбуйнейшымі рэкамі, якія працякаюць па тэрыторыі Докшыцкага раёна, з'яўляюцца Бярэзіна, Вілія і Сервеч. Тут маецца 11 азёр: Палова тэрыторыі раёна пакрыта лесам.



18% агульнай плошчы Докшыцкага раёна займае Бярэзінскі біясферны запаведнік. Тут таксама размешчаны заказнікі “Сервеч”, “Верхневілейскі” і “Галубіцкая пушча”, што стварае выдатныя ўмовы для развіцця экалагічнага турызму.

Адправіўшыся самастойна па адным з маршрутаў або скарыстаўшыся экскурсіяй, вы зможаце даведацца, як выглядала наша зямля да прыходу людзей.





Адміністрацыйным цэнтрам служыць г. Докшыцы. Акрамя таго, тут размешчаны г.п. Бягомль. Па стане на 2019 год насельніцтва гэтага раёна складала 22 396 чалавек. Яго тэрыторыя падзяляецца на 11 сельскіх саветаў.



Касцёл Дзевы Марыіў Параф'янаве, які быў пабудаваны ў 1908 годзе, уяўляе сабой трохнефную базіліку з трансептам. Галоўны фасад упрыгожваюць дзве шмат'ярусныя вежы, паміж якімі, як і над дахам апсіды, размешчаны фігурныя шчыты. У дэкаратыўным афармленні храма выкарыстаны пілястры, шырокія прафіляваныя карнізы і франтоны, што надае яму рысы неакласіцызму.



Вёска Порплішча па праве ганарыцца Спаса-Праабражэнскай царквой. Яна была пабудавана ў 1627 годзе і такім чынам уяўляе сабой адзін з самых старажытных драўляных храмаў, які захаваўся на тэрыторыі Беларусі. Першапачаткова Спаса-Праабражэнская царква належала ўніяцкай абшчыне, аднак у XIX стагоддзі яна была перададзена

праваслаўным і часткова перабудавана (менавіта тады з'явілася трох'ярусная вежа-званіца з бабінцам). Гэты храм мае ў плане форму лацінскага крыжа. Да нашых дзён дайшла частка першапачатковага інтэр'еру, уключаючы фрагменты разьбянога драўлянага алтара, датаванага XVII стагоддзем.



Царква Пакрова Прасвятой Багародзіцы ў Докшыцах, чыё будаўніцтва пачалося ў 1900 г.і было завершана ў 1903 г., з'яўляецца помнікам архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю. У яе аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі дамінуе шатровая званіца, якая ўзвышаецца над бабінцам. Васьмігранны барабан, размешчаны над чатырохсхільным дахам, увенчаны цыбульным купалам. У 2003 г.у ходзе рэстаўрацыйных работ мастаком у. Марковцем адноўлена насценная роспіс пачатку XX стагоддзя.



Драўляная царква Святога прарока Іллі ў Камайску-помнік народнага дойлідства-была пабудавана ў XVIII стагоддзі і рэканструявана ў 1993 годдзе. Храм сфарміраваны двума квадратнымі ў плане зрубамі малітоўнай залы і апсіды, над якой двухсхільны гонтавы дах пераходзіць у вальмавае пакрыццё. На галоўным фасадзе дах прарэзаны чацверыковай шатровай званіцай. Сцены гарызантальна абабітыя, расчлянёны брусамі ў прасценках прамавугольных аконных праёмаў.



Свята-Георгіеўская царква ў Туміла вічах, збудаваная ў 1864 г.з дрэва, з'яўляецца помнікам народнага дойлідства. Гэты храм уяўляе сабой васьмігранны зруб, да якога прымыкаюць прамавугольныя бабінец і апсіда. Кампазіцыю завяршае васьмігранны барабан, шацёр якога ўвянчаны цыбулепадобнай галоўкай і апяразаны побач трохкутных франтонаў. Такімі ж франтонамі завершаны грані аб'ёмаў. Гарызантальна ашаляваныя фасады расчлянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі.



Царква вялікапакутніка Георгія Перамаганосца ў Сітцах пабудавалі ў 1913 г.з каменя. Сярод ахвярадаўцаў на будаўніцтва храма былі цяпер прылічаныя Рускай Праваслаўнай Царквой да ліку святых імператар Мікалай II і протаіерэй Іаан Кранштацкі. Гэты помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю належыць да крыжова-купальным храмам са званіцай. У дэкоры царквы выкарыстаны какошнікі, ліштва арачных аконных праёмаў і да т. п.



Касцёл Святога Яна Хрысціцеля ў Ваўкалаце быў

пабудаваны ў 1870 годдзе з каменя і цэглы, яго даўжыня складае 40 метраў, Шырыня – 20, вышыня – 20 метраў. Прамавугольны ў плане будынак без вежаў, з круглаватай апсідай, двума сакрысціямі і бабінцам акружаны атынкаванай агароджай з двух'яруснай званіцай у левым куце і арачнымі варотамі ў цэнтры. Помнік архітэктуры з элементамі псеўдабарока



Касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў Докшыцах упрыгожыў гэты горад у 1994 г.з цэглы. У 2001 оддзе быў заснаваны кляштар францысканцаў, які далучылі да касцёла ў выглядзе прамавугольнага двухпавярховага будынка. Асобна ўзвялі яшчэ адзін корпус манастыра са складанай асіметрычнай аб'ёмна-прасторавай пλаніроўкай. Касцёл Найсвяцейшай Тройцы ў Докшыцах уяўляе сабой прамавугольны будынак пад двухсхільным дахам. Да фасада асіметрычна далучана чатырохгранная вежа-званіца. Фасад завершаны двухгранным шчыпцом.



Сядзібна-паркавы комплекс у Сітцах упершыню згадваецца ў 1567 годдзе як уласнасць магнацкага роду Хадкевічаў. У XVII-XVIII стагоддзях ён належаў Бжастоўскім. У 1798 годдзе Сітцы сталі ўласнасцю роду Дамеек. Адзін з уласнікаў-Тадэвуш Дамейка - быў родным дзядзькам Ігната Дамейкі. Геральдыст Адам Банецкі пісаў, што Ігнат быў ахрышчаны ў касцёле, які ўпрыгожвае Д. Параф'янава. Таму некаторыя краязнаўцы лічаць, што знакаміты навуковец і нацыянальны герой Чылі мог быць народжаны ў Сітцах.

Уезд у парк афармлены манументальнай трох'яруснай брамай. У ёй меўся драўляны механізм, які забяспечваў ход вялікіх гадзін з зязюляй. Брама з'яўляецца малой архітэктурнай формай у стылі барока пачатку XVIII стагоддзя. На сённяшні

дзень ад сядзібы таксама засталіся калоны палацавага порціка, некалькі будынкаў XVIII – XX стагоддзяў.і агароджа.



Сядзіба ў Гняздзілава, адным з самых старажытных паселішчаў раёна, вядомым з 1407 года., пачала фарміравацца памешчыкамі Слатвінскімі на месцы старой барочнай сядзібы ў першай палове XIX стагоддзя. Яна працягвае традыцыі класіцызму. У межах сядзібы былі пабудаваны сыраварня, Кузня, вадзяны млын, паравы млын з цыркуляркай, электрастанцыя.



За сядзібным домам на плошчы 3 га. размяшчаўся парк, які захаваўся ў сваіх межах да цяперашняга часу. У сядзібе было тры алеі, адна з якіх захавалася. На ўскраіне рэштак парку знаходзіцца адроджаная капліца Козел-Паклеўскіх. У ёй былі пахаваныя і прадстаўнікі роду Шышак.

## Яны ўзбагацілі культуру Докшыччыны



Сакалоўскі Несцер Фёдаравіч нарадзіўся 9 лістапада 1902 года ў в. Вешкі Докшыцкага раёна. Беларускі кампазітар, хормайстар, фалькларыст. Скончыў Мінскі музычны тэхнікум (1931, клас кампазіцыі М. Аладава). З 1932–1935 год вучыўся ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1926 па 1931 год – акцёр і хормайстар БДТ-3, у 1931–1937 гадах – кіраўнік самадзейных хораў. Адзін з арганізатараў і хормайстар ансамбля беларускай народнай песні і танца Беларускай дзяржаўнай філармоніі (1937–1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны, пасля звакуацыі з Мінска, некаторы час працаваў на адным з ваенных заводаў, а затым з 1941 па 1943 год служыў у савецкай арміі. З 1943 па 1944 год – мастацкі кіраўнік Палескага абласнога ансамбля песні і танца, у 1944-1946 – начальнік аддзела мастацкай самадзейнасці Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, з 1946 года – старшы рэдактар рэдакцыі музычнай літаратуры Белдзяржвыдавецтва.

Аўтар музыкі Дзяржаўнага гімна БССР (верш А. Клімовіча), многіх хораў, песень на вершы Янкі Купалы, Якуба Коласа, П. Броўкі, М. Машары, А. Русака, М. Чарота, А. Якімовіча і інш., інструментальных мініяцюр, вакальных сюіт на тэмы беларускіх народных песень.

Запісаў і апрацаваў больш за 500 беларускіх народных песень (у тым ліку «Ой ты, белая бярозанька», «Падушачка», «Чабарок», «Чаму зязюля не кукавала») і найгрышаў. Імя Н. Ф. Сакалоўскага прысвоена Гомельскаму каледжу мастацтваў.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» (1944), двума медалямі.

Памёр Несцер Фёдаравіч Сакалоўскі 13 лістапада 1950 года.



Свірка Юрась. (Юрый Мікалаевіч, псеўданімы Банадысь Кастрыца, Гарчыца). Нарадзіўся 6 мая 1938 года ў вёсцы Маргавіца Бягомльскага пасялковага Савета. У 1953 годдзе скончыў Бягомльскую сярэднюю школу, у 1959 – аддзяленне журналістыкі БДУ. Некалькі месяцаў працаваў стылістам у часопісе “Камуніст Беларусі”. З 1959 па 1961 год –літсупрацоўнік рэдакцыі газеты “Чырвоная змена”, з 1961 года – старшы рэдактар літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё. З 1975 года – загадчык аддзела прозы і паэзіі газеты “Літаратура і мастацтва”. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў да 1961.

Многія яго творы перакладзены на рускую, украінскую, літоўскую, грузінскую, таджыкскую, польскую, англійскую мовы. Песні на яго вершы напісалі М. Аладаў, Э. Зарыцкі, В. Кандрасюк, М. Наско, Ю. Семяняка і інш.

Узнагароджаны медалём, Ганаровай граматай і граматамі Вярхоўных Саветаў БССР, Літоўскай ССР. Літаратурнай прэміяй імя А. Куляшова ў 1993, за зборнік паэзіі «Узаемнасць».

Памёр 31 жніўня 2010 года.



Ставер Алесь (Аляксандр Сяргеевіч, псеўданім Алесь Зарачанскі) – беларускі паэт, празаік, драматург. Нарадзіўся 10 ліпеня 1929 года. ў вёсцы Маргавіца Бягомльскага пасялковага Савета.. Да Вялікай Айчыннай вайны скончыў 5 класаў Бягомльскай сярэдняй школы. У час вайны разам з бацькамі жыў у партызанскай зоне. Вясной 1944 года ў час блакады згубіў бацьку і братоў. Калі трапіў да немцаў, быў вывезены ў канцлагер у Германію. У верасні 1945 года вярнуўся дадому і працягваў вучыцца ў школе. Пасля заканчэння Бягомльскай сямігодкі Алесь Ставер паступіў у Барысаўскае педвучылішча. Пасля заканчэння ў 1949-50 гадах быў старшым піянерважатым і адначасова выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Бягомльскай сярэдняй школе. У 1950 годзе паступіў на філалагічны факультэт Мінскага педінстытута.

Да гэтага часу ён ужо пісаў вершы, таму быў перакананы ў неабходнасці далейшай вучобы. Пасля заканчэння інстытута працаваў інспектарам школ Лагойскага раёна (1954-55), быў літсупрацоўнікам газеты “Калгасная праўда”, літаратурным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1955-56), загадваў літаратурнай часткай Белдзяржфілармоніі (1956-61). З 1961 года малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. З 1975 па 1984 год Алесь Ставер карэспандэнт-арганізатар Бюро прапаганды Саюза беларускіх пісьменнікаў. З 1984 года знаходзіўся на творчай рабоце. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1962 года.

Загінуў у аўтакатастрофе 23 ліпеня 1995года. Пахаваны ў Мінску.

Стадольнік Іван Канстанцінавіч -беларускі празаік, паэт. Нарадзіўся 12 верасня 1940 года. ў вёсцы Янкі Докшыцкага сельсавета. Бацька Канстанцін Сцяпанавіч загінуў у 1945 годдзе на фронце пры штурме Кёнігсберга. Маці Вольга Паўлаўна жыла ў роднай вёсцы, працавала ў калгасе. У 1947 годдзе Іван Стадольнік пайшоў у 1-ы клас Янкоўскай пачатковай школы, але правучыўся толькі да зімы, бо не было абутку і не хапала гадоў. Пасля заканчэння ў 1959 годдзе Докшыцкай сярэдняй школы працаваў у калгасе імя Суворава Докшыцкага раёна, качагарам на цаліне (на станцыі

Купрыянаўка Рузаеўскага р-на Какчатаўскай вобл.). Вярнуўшыся адтуль, зноў працаваў у калгасе, потым бібліятэкарам Бярозаўскай бібліятэкі Докшыцкага раёна. У 1960 годдзе паступіў на зубаўрачэбнае аддзяленне Полацкага медвучылішча, якое скончыў у 1963. Да 1967 года быў зубным урачом і ВА галоўнага ўрача Мосарскай сельскай бальніцы Глыбоцкага раёна. Адначасова вучыўся завочна на факультэце журналістыкі БДУ (1965 – 71). З 1967 па 1971 год – адказны сакратар, з 1971 – загадчык аддзела сельскай гаспадаркі полацкай аб'яднанай газеты "Сцяг камунізму". З 1980 года рэдактар аддзела літаратуры, з 1984 года. адказны сакратар часопіса "Вожык", з 1991 года. часопіса "Тэатральная Беларусь". Член Саюза беларускіх пісьменнікаў з 1980.



Вершы пачаў пісаць у школьныя гады. Асобныя гумарэскі пісьменніка перакладаліся на літоўскую, рускую, украінскую, армянскую і інш. мовы. Песні на вершы І. Стадольніка напісалі Дз. Лукас, М. Пятрэнка. Аўтар шматлікіх вершаваных подпісаў пад агітплакатамі.

Памёр 4 мая 2021 года.



Кірвель Анатоль Мяфодзьевіч - беларускі пісьменнік, публіцыст, грамадска-культурны дзеяч. Нарадзіўся 23 ліпеня 1939 года ў вёсцы Вітунічы Бярозкаўскага сельсавета. З 1968 па 1971 год вучыўся ў Мінскім дзяржаўным педінстытуце замежных моў. Працаваў у Карэліі, Валагодскай вобласці (Расія). З 1977 года жыве ў СанктПецярбургу. Быў слесарам, маляром, мастаком-афарміцелем, будаўніком.

Рэдактар-выдавец незалежнай газеты пецярбургскіх беларусаў "Родзічы" (выходзіць са снежня 1991). Старшыня суполкі міжнароднага фонду Я. Купалы, член Рады Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Санкт-Пецярбургу, прэзідэнт Незалежнай асацыяцыі аматараў прыгожага пісьменства "Новая Беларусь" (Санкт-Пецярбург), якая займаецца наладжваннем літаратурных сувязей пецярбургскай дыяспары з Бацькаўшчынай. Удзельнічаў у Мінску ў рабоце І Міжнароднага кангрэса беларусістаў (1991), Сходу беларусаў блізкага замежжа (1992), 1-3-га з'ездаў беларусаў свету (1993, 1997, 2001). Член Саюза беларускіх пісьменнікаў (1995).

Памёр 8 мая 2008 г., пахаваны ў Тарасаве пад Мінскам.



Палачанін Фёдар Антонавіч нарадзіўся 27 ліпеня 1951 года ў вёсцы Чаркасы Докшыцкага раёна, ў сям'і праваслаўных вернікаў. У 1974 годзе скончыў філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага.

У дзяцінстве ў Фёдара Палачаніна былі дзве мары: стаць артыстам або настаўнікам.

Стаў настаўнікам, але не здрадзіў і сваёй першай мары. Шмат гадоў выступаў у Докшыцкім народным тэатры. У 1995 годзе яму прысвоена званне артыста народнага тэатра. Яго тэатральная кар'ера складвалася вельмі добра. Калі ў першым спектаклі "Свае людзі – паладзім" А. Астроўскага выканаў ролю аканома Падхалюдзіна, то ў другім – "Хто смяецца апошнім" К. Крапівы – ролю дырэктара інстытута Гарлахвацкага, а ў трэцім – "Мудрамер" М. Матукоўскага – ролю намесніка міністра па зацвярджэннях Міралюбава. У спектаклі "Паўлінка" Я. Купалы іграў ролю пана Адольфа Быкоўскага, за якую атрымаў прыз сімпатыі гледачоў. Потым давялося выканаць ролю Міхалкі ў спектаклі "Міхалка" Далецкіх, войта Навума Прыгаворкі з "Ідыліі" В. Дуніна-Марцінкевіча і, нарэшце, Васіля са сваёй камедыі "Расплата за нелюбоў".

Літаратурнай творчасцю пачаў займацца позна, пражыўшы больш за сорак гадоў. Гэты занятак для яго быў вельмі нечаканым. Паколькі Вышэйшая Сіла накіравала яго на літаратурную творчасць, Голас Сумлення падказвае пастаянна звяртацца да рэлігійнай тэмы. Ёй прысвечаны многія яго работы. У мастацкіх творах рэлігійная тэма ідзе побач з тэмай кахання, дружбы, адзіноты.



Зубрыцкі Эдуард Іосіфавіч– беларускі паэт, журналіст. Нарадзіўся 17 красавіка 1942 года ў вёсцы Шклянцы Бярозкаўскага сельсавета. У 1968 годзе скончыў БДУ Працаваў настаўнікам у Чашніцкім і Верхнядзвінскім раёнах. З 1971 года быў супрацоўнікам рэдакцыі верхнядзвінскай раённай газеты "Дзвінская праўда". Першыя вершы надрукаваў у 1960 годдзе ў часопісе "Маладосць".

З гэтага часу яго творы пачалі з'яўляцца таксама ў часопісах "Полымя", "Беларусь", "Работніца і сялянка", рэспубліканскіх і абласных газетах.

Памёр у маі 2008 года



Французская мастачка і грамадскі дзеяч Надзея Хадасевіч-Лежэ (05.11.1904 – 08.05.1983) з'явілася на свет у д.Асецішча. Дзверы ў свет прыгажосці перад дзяўчынкай адкрыў Палац мастацтваў у сярэднярускім мястэчку Бялёве. Затым была вучоба ў Смаленску, у дзяржаўных мастацкіх майстэрнях у Казіміра Малевіча. З 1924 года Надзея Хадасевіч-Лежэ жыла ў Парыжы. Працавала ў манументальным і станковым жывапісе, манументальна-дэкаратыўным мастацтве. Аўтар мазаічных партрэтаў Ю. Гагарына, Ж.Дзюкло, Н. Крупскай, У. Маякоўскага і інш. выканала 26 мазаічных станковых партрэтаў У. Леніна, дзве кампазіцыі з яго выявай для аэрапортаў у Парыжы і Вашынгтоне. Сярод жывапісных работ: «Начало движения», «Натюрморт с вазой», «Автопортрет», «Зоя», «Колхозницы», «От имени миллионов наших детей требуем мира» і інш.

Мастачка мела персанальныя выставы ў СССР, узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам Ганаровага легіёна Францыі.



Крываблоцкая Галіна Пятроўна нарадзілася 26 ліпеня 1953 года ў вёсцы Янкі Докшыцкага сельсавета. У 1976 годдзе скончыла Беларускі тэатральна мастацкі інстытут. Вучылася ў П.В. Масленікава, А.В. Бараноўскага, М.Ф. Раманюка. З 1976 года працавала на Барысаўскім камбінаце прыкладнога мастацтва, з 1993 года – выкладчык Беларускага каледжа мастацтваў. Працуе ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Удзельніца мастацкіх выстаў з 1976 года. Сябра Беларускага саюза мастакоў (1985).

Пасля вучобы ў тэатральна-мастацкім інстытуце, творчы шлях мастачкі пачаўся з працы над сцэнічнымі вобразамі да фолк-оперы-прытчы “Песня пра долю” у выкананні ВІА “Песняры”. Потым былі распрацаваны сцэнічныя касцюмы для іншых калектываў Рэспублікі Беларусь. Але ўсё ж у творчасці Галіны асноўнае месца займае габелен. Дыяпазон яе творчасці шырокі: ад

інсталяцыі да аб”ёмнай тэкстыльнай пластыкі, ад міні-габелена да манументальных габелен-заслонаў.

Творы Галіны Крываблоцкай знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Літаратурным музеі Я. Купалы (Мінск), Музеі беларускай культуры ў г. Гайнаўка (Польшча), Палацы культуры г. Бярдзічаў (Украіна), у прыватных зборах у ЗША, Індыі, Германіі і інш



Маркавец Віктар Пятровіч– беларускі жывапісец. Нарадзіўся 5 ліпеня 1947 года ў горадзе Докшыцы.. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1971). Вучыўся ў І.Ахрэмчыка. Працуе ў розных жанрах станковага жывапісу. Удзельнік мастацкіх выставак з 1971 г. Член Беларускага саюза мастакоў (1977). Прэмія Ленінскага камсамола Беларусі (1980). Віктарам Маркаўцом напісана звыш 200 карцін, якія экспанаваліся больш як на 20 персанальных і шматлікіх групавых рэспубліканскіх выстаўках, набылі вядомасць на радзіме і ў замежжы.

Галоўнай тэмай мастацтва В. Маркаўца, яго творчых памкненняў застаюцца думкі пра радзіму бацькоў, пра Докшыцкі край, куды ён бясконца вяртаецца з блізкіх і далёкіх паездак, якія толькі пашыраюць яго творчае бачанне, даюць магчымасць яшчэ глыбей зразумець каштоўнасць адвечнага, традыцый, памяці.

Творы мастака знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, фондах Беларускага саюза мастакоў, Літаратурным музеі М.Багдановіча, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва, Літаратурна-мемарыяльным музеі Я.Коласа (Мінск), Гісторыка-культурным запаведніку ў Заслаўі, Віцебскім абласным мастацкім музеі імя П Масленікава, выставачным аб’яднанні “Цэнтральны Дом мастака” ў Маскве, Музеі беларускай культуры ў г. Гайнаўка (Польшча), у прыватных зборах за мяжой і на радзіме.

Памёр 17 верасня 2013 года.



Барздыка Міхаіл Фёдаравіч – беларускі графік. Нарадзіўся 14 студзеня 1944 года ў вёсцы Шклянцы Бярозкаўскага сельсавета. У 1949 годзе сям’я пераехала ў г.п. Плешчаніцы. У 1973 годдзк скончыў Мінскі мастацкі інстытут, выкладаў у ім. З 1975 года супрацоўнічаў з беларускімі выдавецтвамі.

У 1986 годзе скончыў Маскоўскі паліграфічны інстытут.

Працуе ў станковай (пераважна афорт), кніжнай графіцы. Творчасць адметная спалучэннем філасофскага разумення жыцця і лірычнай інтэрпрэтацыі (дыптых «Воблакі і камяні», 1988; «Метамарфозы», 1992; «Варыяцыі на тэму восені», 1994; «Падабенства», 1995; і інш.). Творы мастака захоўваюцца ў музеях Беларусі, Венгрыі, ЗША, Італіі, Расіі, Францыі.

Удзельнік мастацкіх выставак з 1976 года. Яго творы адзначаны сярэбраным медалём на XXII Міжнародным салоне ў Бельгіі (1992) і залатым медалём Еўрапейскай акадэміі мастацтваў (1993). Кніга «Нетры», афармленая ім, на Франкфурцкім кніжным кірмашы 2005 года ўвайшла ў лік 100 лепшых кніг свету, а выданне «Палын. Чарнобыль» (2006) атрымала на Міжнародным конкурсе ў Бельгіі залаты медаль.

У 2001 годзе праілюстрыраваў выданне кнігі «Сымон-музыка» Я. Коласа.

Член Беларускага саюза мастакоў з 1990 года.



Барздыка Павел Фёдаравіч –беларускі мастак. Нарадзіўся 9 лютага 1929 годаў вёсцы Шклянцы Бярозкаўскага сельсавета. Працуе ў графіцы і кніжным афармленні.

У Вялікую Айчынную вайну ў сакавіку 1943 года быў вывезены ў Германію на прымусовыя работы. У 1949 годдзе сям’я пераехала ў г.п. Плешчаніцы. У 1956 годдзе скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, Маскоўскі паліграфічны інстытут у 1965. Пасля заканчэння Мінскага мастацкага вучылішча працаваў у друкарні імя Сталіна. З 1960 года мастацкі рэдактар выдавецтва “Ураджай”, з 1967 года на Мастацкім камбінаце. Лаўрэат рэспубліканскіх, саюзных і міжнародных конкурсаў і выставак “Мастацтва кнігі”.



Хршчановіч Казімір Вікенцій Мельхіёравіч – беларускі архітэктар. З патомных дваран Мінскай губерні. Нарадзіўся ў 1794 годзе ў маёнтку Бястроск (каля былой вёскі Шунеўка) Вітуніцкай воласці Барысаўскага павета, цяпер Докшыцкі раён. Пасля заканчэння ў 1819 годдзе Віленскага універсітэта атрымаў ступень кандыдата філасофіі. 16 марта.1824 года прызначаны памочнікам універсітэцкага архітэктара. 7 мая 1825 года здаў дадатковы экзамен і атрымаў званне архітэктара. 13 кастрычніка 1825 года Казімір Хршчановіч прызначаны мінскім губернскім архітэктарам (на гэтай пасадзе працаваў да 1863), з 1863 года тытулярны саветнік са старшынством. Найболыш значныя работы Хршчановіча ў Мінску: адміністрацыйны будынак на рагу пл. Свабоды і

вул. Інтэрнацыянальнай, будынак вайсковага шпіталя, будынкі гарадской бальніцы у 1840-я гады, будынак мужчынскай гімназіі, губернатарскі дом (канец 1830-х гадоў). Ён таксама аўтар праектаў: у Мінску – ратушы (1825), жылога дома Аксельрода (1844), адміністрацыйных устаноў (1847, 1852, 1853, 1857) і інш.; у Барысаве – адміністрацыйных устаноў (1843); у Пінску – жылога дома А.Ліпко (1847) і інш. У коле мінскай інтэлігенцыі Хршчановіч лічыўся добрым знаўцам музыкі. Вядомыя музыканты, якія наведвалі Мінск, спыняліся ў яго доме і давалі невялікія канцэрты.

Памёр 8 мая 1871

**Змест**


З гісторыі раёна 1

З гісторыі горада 3

Докшыцкі раён – Спадчына Беларусі 8

Яны ўзбагацілі культуру Докшыччыны 14